**Гавяйновіч, В.** Упершыню не выканалі загад / В. Гавяйновіч // Полацкі веснік. — 2012. — 14 лют. — С. 4.

## УПЕРШЫНЮ НЕ ВЫКАНАЛІ ЗАГАД



**Канстанцін Пылінскі ў Афганістан трапіў у 1988 годзе. Збіраліся выводзіць савецкія войскі, патрэбны былі аўтамабілісты.**

Сам ён родам з Вароніч. Закончыў тут сярэднюю школу, пасля – прафтэхвучылішча ў Пашуціне, атрымаў пасведчанне вадзіцеля. А ў хуткім часе быў ужо на Далёкім Усходзе, у сяле Духаўское ў прыгранічным раёне, дзе ў мотастралковым батальёне праходзіў тэрміновую службу. У 1975 годзе вярнуўся, як ён сказаў, – на радзіму. Праз два гады ажаніўся і працаваў на прадпрыемстве «Полацклес». Без адрыву ад вытворчасці закончыў Бабруйскі аўтатранспартны тэхнікум. Стаў шчаслівым бацькам: у сям'і Пылінскіх нарадзіліся двое дзяцей – старэйшы сын Андрэй і дачка Алена.

Надышоў 1988 год. Яго выклікалі ў ваенкамат. Для вываду войск з Афганістана неабходны былі спецыялісты. Ён даў згоду. Канстанціну Пылінскаму было прысвоена званне прапаршчыка, і 1 чэрвеня 1988 года яны, трынаццаць спецыялістаў з Беларусі (дарэчы, як ён казаў, іх група была апошняя, якая накіроўвалася ў Афганістан), былі ў Ташкенце. Але на вайне заўсёды многае нечакана мяняецца. Канстанціна Канстанцінавіча накіравалі камандзірам узвода палявога водазабеспячэння інжынерна-сапёрнай роты. Можна толькі ўявіць стратэгічнае значэнне іх аб'екта: вада ў Афганістане заўсёды была на вагу золата. На іх заставе былі прабураны тры глыбінныя свідравіны, вада фільтравалася і трапляла па прызначэнні: частка ішла па трубах у часць, частка – на заставы.

Канстанцін Канстанцінавіч кажа, што ён больш вучыўся ў салдат, чым яны ў яго. Аб'ект іх быў уладкаваны. Ахоўваць яго салдатам дапамагалі пяць вартавых сабак, і яны, як сцвярджае Канстанцін Канстанцінавіч, унеслі вялікі уклад у іх агульную справу. Калі прыязджаў на заставу хто-небудзь з афганцаў, сабак нельга было супакоіць.

Што яшчэ больш за ўсё ўражвала, дык гэта салдацкая дружба. У яго ўзводзе служылі два беларусы, два узбекі, казах, туркмен... і ўсе – як адна сям'я. Усе за адным сталом, і ніякай нацыянальнай варожасці. Пярэдняга краю ў іх не было. Перад імі горы, а вакол – толькі заставы.

У лютым 1989 года з 13-га на 14-е іх група адыходзіла апошняй. За імі заставаўся толькі батальён аховы генерала Громава.

Напярэдадні яго выклікалі да камандзіра і загадалі: вартавых сабак яны не могуць браць з сабой у Саюз. Іх трэба ўсыпіць. А што такое для салдата сабакі і на пярэднім краі? Гэта ж самыя верныя сябры. Канстанцін Канстанцінавіч вярнуўся ў свой узвод і суткі маўчаў. Калі агучыў перад салдатамі загад, адзін сяржант сказаў: *“Я застаюся тут з сабакамі, у Саюз не паеду”.* І тады, яны ўсе парушылі загад. Сабак схавалі і разам з імі пераходзілі граніцу.

*“Я азірнуўся на нашу калону, калі пераходзілі граніцу*, – расказвае Канстанцін Канстанцінавіч, – *гляджу: нашы сабакі высунулі галовы з чырвонымі бантамі і раздзяляюць агульную радасць”*.

Калона савецкіх войскаў расцягнулася да пяці кіламеіраў. І на ўсім шляху іх сустракалі мясцовыя людзі. Уручалі цукеркі, праснакі, лавашы. Гэта была такая радасць… Некаторых салдат прыехалі сустракаць бацькі.

І было развітанне. Сабак сваіх яны ўсіх прыстроілі, аддалі мясцовым ваенным. *“Але, як развіталіся салдаты са сваімі чатырохногімі сябрамі, – цяжка было глядзець”*, – успамінае Канстанцін Канстанцінавіч.

Вярнуўшыся пасля службы ў Афганістане дамоў, Канстанцін Пылінскі працягваў служыць у Полацкім РАУС, у дзяржаўнай аўтаінспекцыі.

Цяпер ён у адстаўцы, жыве ў вёсцы Экімань – гэта радзіма яго бацькі. Па-ранейшаму чалавек актыўны, узначальвае ветэранскую арганізацыю экіманскага сельсавета. Кажа: *“Люблю сустракацца з людзьмі, гутарыць з імі”*. Вайна навучыла яго, што такое ваеннае брацтва, што такое ўвогуле брацтва, якое не залежыць ад нацыянальнасці.

**В. Гавяйновіч**